Бібліятэчныя ўстановы Гродзенскага рэгіёна для жыхароў аддаленых вёсак напярэдадні **Дня Перамогі** арганізавалі выезды **імправізаванай франтавой бібліятэкі (бібліобуса)** “Вайна. Перамога. Памяць”, “Рэха нашай памяці”.

У рамках абласной эстафеты памяці стартавалі акцыі “Пераможны май”, “Ветэран жыве побач”, “Падзяка землякоў”, “Вокны Перамогі”, “Голуб міру і надзеі”, “Захоўваючы памяць аб вайне”, “Чытаем дзецям аб Вялікай Айчыннай вайне”, “Прачытайце кнігу пра вайну!” і інш.

Запрашаюць публічныя бібліятэкі Прынямоння прыняць удзел у сацыякультурных мерапрыемствах ваеннай тэматыкі.

***3 мая*** патрыятычныя чытанні “Слава табе, салдат” арганізавалі бібліятэкі Карэліцкага раёна, на інтэрактыўны квэст “Дарогамі Вялікай Айчыннай” запрашалі ў Ваўкавыскім, гістарычны экускурс “Я родам не з дзяцінства – з вайны” ладзілі ў Іўеўскім.

***4 мая*** Слонімская раённая бібліятэка імя Я. Коласа праводзіць тэлемост з Муніцыпальнай бюджэтнай установай культуры “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма імя Аляксандра Трыфанавіча Твардоўскага” (г. Гвардзейск, Калінінградская вобласць, Расія), на Дзень чытання “Чытаць, ведаць, памятаць” запрашаюць рабят бібліятэкі Смаргоншчыны, гадзіны памяці “Стаялі як салдаты гарады-героі” – гарадскія бібліятэкі г. Гродна.

***5 мая*** ў Воранаўскім раёне прысвечаны Дню ваеннай кнігі “Старонкі гэтых кніг – гісторыя вайны”, у Дзятлаўскім ладзяць гадзіну баявой славы “Ведаць, каб памятаць, памятаць, каб ганарыцца”, у Лідскім арганізуюць рэпартаж памяці “Мы будзем шанаваць ваш подзвіг вечна”.

***6 мая*** ў публічных бібліятэках Свіслаччыны стартуе раённая патрыятычная акцыя “Помнім 41-й, славім 45-й”, у Зэльвенскім – “Наша

памяць героям загінуўшым, наш паклон ветэранам жывым”, літаратурная галерэя аб вайне “Ад пачатку вайны да парада Перамогі” будзе праходзіць у Астравецкім раёне.

***7 мая*** абласная эстафета памяці працягваецца ў сельскіх бібліятэках Гродзенскага раёна, дзе наведвальнікам прапануюць дакументальнае эсэ “Вольга Соламава: партызанка, сакратар Гродзенскага падпольнага гаркама камсамола”, а ў Бераставіцкім раёне адкрыецца музычная старонка “Гэтыя песні гучалі на вайне”, урокі памяці “Паклонімся вялікім тым гадам” пройдуць у бібліятэчных установах Навагрудчыны.

***8 мая*** віртуальная экскурсія “Мужнасць, ушанаваная ў камені” (аб мемарыялах і помніках загінуўшым воінам) адбудзецца ў бібліятэках Ашмянскага раёна, гадзіна памяці “Вайна: і боль, і памяць, і ўрок” – у Мастоўскім, Дзень ваенна-патрыятычнага чытання “Памяць пра вайну нам кніга пакідае” – у Шчучынскім.

***9 мая*** ўсе дзяржаўныя ўстановы культуры бібліятэчнага тыпу вобласці арганізуюць інтэрактыўныя пляцоўкі “Дзевяты дзень пераможнага мая”, “Подзвігу – шлях у вечнасць”, “І зноў май, салют, кветкі і слёзы...”, “Па дарогах Вялікай Перамогі”, “Была вайна. Была Перамога”, “Наша памяць жыве – наша памяць святая”, “Не згасне летапіс Перамогі!”, “Подзвіг жыцця ў стагоддзях” і г.д.